*Да творчага партрэта Пятра* **ПРЫХОДЗЬКІ**

# САЛДАТ

Пісаць пра сябра лёгка і адначасна цяжка: лёгка таму, што ведаеш яго даўно, а цяжка таму, што з яго біяграфіі трэба выбраць галоўнае, непаўторнае.

Дзейнасць паэта Пятра Фёдаравіча Прыходзькі можна вызначыць адным словам—гарэнне. Яго можна часта ўбачыць у студэнцкай аўдыторыі, у школе, на заводзе сярод рабочых, у клубе калгаснай вёскі. У сваіх вершах паэт-франтавік выказаў думкі, жаданні сваіх аднагодкаў, якія са зброяй у руках баранілі свабоду сваёй Радзімы і дайшлі да вялікай Перамогі.

Я перагортваю старонкі сваёй памяці і бачу далёкі 1945 год, калі былыя франтавікі вярнуліся з вогненных дарог вайны, сустрэчы з імі, чую іх гутаркі, успаміны. Бачу сяброў па зброі: Анатоля Вялюгіна, Міколу Гамолку, Кастуся Кірэенку, Пятра Прыходзьку. Чую, як гучаць іх вершы, напісаныя на кароткіх прывалах, у акопах. Запаў мне ў сэрца верш Пятра Прыходзькі «Калі я нарадзіўся», у якім паэт прыгадвае сваё дзяцінства:

**Я на свет нарадзіўся**
**ў дваццатым,**
**Калі бацька акопы капаў.**
**Бліскавіцы трымцелі**
**над хатай,**
**Гром гарматы калыску**
**гушкаў.**

Не памятае паэт матчынай калыханкі, пяшчотнага дотыку матчыных рук. Калі яму было восем месяцаў, тыфус скасіў дарагога для яго чалавека. Нават у сям'і не захаваўся здымак маці. Бацька ў гэты час быў на фронце грамадзянскай вайны. Нялёгкай сцяжынкай ішло яго дзяцінства. Выхоўваў яго дзед Яфім Іванавіч Пруднікаў. Гэта быў мудры селянін, які далучыў да працы асірацелага ўнука, які рана пазнаў смак хлеба, адчуў, як пякуць мазалі далоні ад працы ў полі, на лузе — касой ці плугам. Паэт потым прыгадвае сваё жыццё:

— Вёска Альшоў стаіць каля самага Хоцімска, непадалёку ад ціхай Бесядзі. Людзі жылі ў ёй бедна, у маленькіх хатках з саламянымі стрэхамі, што туліліся адна да адной. Зямлі было мала.

Незабыўныя гады маленства Пятра Фёдаравіча асветлены ўспамінамі пра яго родную вёску, дзе вучыла яго ў пачатковай школе маці А. Куляшова Екацярына Фамінічна. Можа, яна ў маладое сэрца свайго здольнага вучня пасеяла светлыя зярняты паэзіі, якія потым далі буйныя ўсходы.

Пасля заканчэння сярэдняй школы Пётр Фёдаравіч вучыцца ў Магілёўскім газетным тэхнікуме, потым працуе ў хоцімскай раённай газеце «Калгасная зорка», дзе друкуе свае першыя вершы. Паэт прызнаецца, што самай адметнай і памятнай падзеяй у яго маладосці была сустрэча з паэтам-земляком А. Куляшовым у 1938 годзе. Гэтая сустрэча вызначыла напрамак далейшай дзейнасці маладога паэта. З вуснаў А. Куляшова ён даведаўся, што паэзія патрабуе ўпартай працы над кожным радком, добрага ведання жыцця, мовы. Ён параіў не спяшацца друкаваць напісаны верш, а пачакаць, калі ён вылежыцца.

Айчынная вайна абпаліла юнацтва паэта. У 1939 годзе яго прызвалі ў рады Чырвонай Арміі, калі ён быў студэнтам Мінскага інстытута журналістыкі. Апынуўшыся на Бранскім фронце, паэт сумуе аб роднай вёсцы Альшоў, аб бацькоўскай зямлі. Пасля баёў на Курскай дузе войскі Цэнтральнага фронту паспяхова набліжаліся да Беларусі.

Незабыўная восень 1943 года. Паэт Пятро Прыходзька—журналіст дывізійнай газеты «Призыв Родины». І вось перад вачыма — родная, шматпакутная, але няскораная зямля. З берага Дняпра бачны невялікі гарадок Лоеў. Ён у руках ворага. Асенняй зорнай ноччу быў дадзены загад — фарсіраваць Дняпро. Не задумваючыся, ваенны журналіст Пятро Прыходзька папрасіўся ў батальён, якому загадана фарсіраваць небяспечную рэчку. Не ўсім байцам давялося пераправіцца на правы бераг. Вораг лютаваў, пайшоў у контратаку. Групе смельчакоў удалося ступіць на бераг, заняты фашыстамі. Раптам змоўк кулямёт. Камандзір батальёна украінец Р. І. Мяньшун замяняе забітага кулямётчыка. Няма каму падаваць боепрыпасы. Пятро Прыходзька кідаецца да кулямёта з кулямётнымі лентамі, не зважаючы на моцны варожы агонь.

Пасля паспяховай пераправы і ўтрымання невялікага плацдарма камандзір сказаў Пятру Фёдаравічу:

— А я думаў, што карэспандэнт возьме матэрыял у штабе, а ты сапраўдны салдат, маладзец.

Гэта была заслужаная пахвала.

За гэты бой камандзір батальёна Р. І Мяньшун быў адзначаны званнем Героя Савецкага Саюза, а капітан Пятро Фёдаравіч Прыходзька — ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Паэт радаваўся, што адчуў пад нагамі бацькоўскую зямлю. І ў вершы «За родную Беларусь» ён пісаў пасля бою:

**Праз рэчкі і пушчы, дым**
**горкі баёў**
**Ізноў да цябе я, твой сын,**
**прыйшоў.**
**Зямлі тваёй жменьку**
**я ў рукі бяру,**
**Дзень добры, дзень добры,**
**мая Беларусь!**

У многіх баях Пятро Прыходзька прыраўноўваў пяро да штыка: гэта было і на Сандамірскім плацдарме, і ў баях у Нямеччыне. У цяжкія гады для Радзімы ён становіцца членам КПСС. Гэта абавязвала яго быць у баях першым.

Вершы Пятра Прыходзькі ваеннага перыяду прасякнуты патрыятызмам, любоўю да сваёй зямлі. На суровых ваенных дарогах усплывалі ў яго памяці бацькоўскія мясціны, песні, якія ён чуў ад сваіх землякоў.

**Без гэтых песень,**
**Шчырых і пявучых,**
**Без роднай мовы**
**Я не мог бы жыць.**
**На ёй шумелі мне**
**з дзяцінства пушчы,**
**На ёй вучылі родны край**
**любіць.**

Паэт пражыў нялёгкае жыццё. Багатая ў яго паэтычная ніва. У яго творчым актыве 30 зборнікаў паэзіі.

...Гады бяруць сваё. Паэту семдзесят. Сівізна пасерабрыла скроні. Але ён у творчым пошуку. Новых яму прыступак майстэрства!

Паўлюк **ПРАНУЗА.**

**Прануза, П.** Солдат : Да творчага партрэта Пятра Прыходзькі / Паўлюк Прануза // Настаўніцкая газета. — 1990. — 28 лютага.